# “Лялька.Бай”: з вопыту рэализацыі творчага пректа

*Шпакава Аксана Андрэеўна, метадыст*
*Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі*
*“Цэнтр дзяцей і молодадзі Глыбоцкага раёна”*

**Анатацыя.** Сёння сам час патрабуе ад нас кожнага з нас звярнуцца да сваіх вытокаў, далучыць дзяцей і падлеткаў да беларускай нацыянальнай культуры, паглыбляць знаёмства іх з родным краем, беларускімі традыцыямі, фальклорам, прывіваць пацуцце грамадскасці, любоў да Радзімы, да роднай мовы, якая садзейнічае не толькі яе ўзбагачэнню, але і развівае іх пазнавальныя і інтэлектуальныя магчымасці, пашырае веды пра беларускю культуру. З мэтай далучэння дзяцей і моладзі да вытокаў беларускай народнай культуры, любові да роднай мовы выхаванцамі аб’яднанняў па інтарэсах Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна” быў распрацаваны творчы праект “Лялька.Бай”, які прадугледжвае выраб лялек з беларускім каларытам і музычным суправаджэннем на беларускай мове.



*Навучэнцы ўзорнага тэатра моды “Аліса”з лялькамі*

*Лялька для дзіцяці – гэта спосаб пазнання навакольнага свету, дзякуючы ім дзеці вучацца праяўляць ласку і клопат, апранаць і распранаць сваю цацку, укладваць спаць і карміць з лыжачкі. Падчас любімая лялька становіцца сапраўднай сяброўкай або сябрам, бо ніколі не распавядае староннім сакрэтаў, заўсёды ўважліва выслухае і зразумее, цёмнай ноччу супакоіць і дапаможа заснуць, а днём прадставіць шмат цікавых і займальных заняткаў. А калі лялькам дадаць магчымасць “размаўляць па - беларуску”, то сённяшнія дзеці з павагай будуць ставіцца да беларускай мовы, а таксама размаўляць на ёй.*

Напэўна, у цэлым свеце няма дзіцячых цацак больш унікальных і старажытных, чым лялькі. З далёкіх часоў і да сённяшняга часу археолагі адшукваюць іх паўсюль. У кожным часе розныя народы выраблялі і ўкладвалі ў сваіх лялек уласнае бачанне, часта надзяляючы іх магічнымі магчымасцямі і ўласцівасцямі, але яны ўсё роўна былі і заўсёды застануцца самымі любімымі цацкамі для дзяцей.

Лялька не нараджаецца сама, яе стварае чалавек, а самыя таленавітыя творцы лялек – дзеці. Праз лялечны свет яны ўваходзяць у жыццё і спасцігаюць яе заканамернасці, пазнаюць гісторыю свайго народа. Галоўная каштоўнасць лялькі яшчэ і ў тым, што яна, з’яўляючыся часткай культуры, захоўвае ў сваёй выяве самабытнасць і характэрныя рысы таго народа, які стварае яе,тым самым выхоўваючы ў дзяцей любоў да роднага краю, Радзімы.

Сучасныя гульні ў дзіцячыя лялькі даволі-такі моцна адрозніваюцца сваёй разнастайнасцю і вялікімі магчымасцямі, чым гэта было параўнальна нядаўна, усяго толькі пару дзесяткаў гадоў таму. Вітрыны ўсіх крамаў цацак проста валяцца ад прыгожых лялечных персанажаў, якія прызначаны для самых разнастайных роляў, узростаў і гульняў.Але навучэнцы і педагогі Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі "Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна" знайшлі невялічкую нішу для сваёй задумкі ў гэтым напрамку і распрацавалі творчы праект пад назвай "Лялька.Бай".

**Мэта праекта**: далучэнне дзяцей і падлеткаў да вытокаў беларускай народнай культуры праз выраб лялек з беларускім каларытам і музычным суправаджэннем на беларускай мове.

**Задачы** – знаёмства навучэнцаў з гісторыяй узнікнення і асаблівасцямі лялек беларускага народа, пашырэнне ведаў навучэнцаў пра беларускі фальклор, фарміраванне маўленчых здольнасцей, фарміраванне любові да роднай мовы, выхаванне творчай асобы.

**Удзельнікі** праекта : навучэнцы аб'яднанняў па інтарэсах узорнага тэатра моды "Аліса" і "Чароўны пэндзлік" у супрацоўніцтве з гурткамі вакальных і сольных спеваў "Кропелькі" і "Салавейкі".

Этапы рэалізацыі праекта:

**1 этап падрыхтоўча–арганізацыйны ўключае ў сябе:** знаёмства ўдзельнікаў праекта; наведванне раённай бібліятэкі; ; экскурсія ў гісторыка-этнаграфічны музей г.Глыбокае; экскурсія ў Глыбоцкі Дом рамёстваў праца з інтэрнэт-рэсурсамі; пачатак даследчай дзейнасці; абмеркаванне знойдзеных матэрыялаў.

**2 этап – практычны і прадугледжвае** рэалізацыю асноўных напрамкаў дзейнасці праекта; знаёмства навучэнцаў з гісторыяй узнікнення і асаблівасцямі лялек беларускага народа; знаёмства з народнай музычнай спадчынай беларускага народа; наведванне выставы драўлянай дзіцячай цацкі майстра Глыбоцкага Дома рамёстваў Дудкевіча В.Б.; падбор музычнага і літаратурнага напаўнення для агучвання лялек; распрацоўка эскізаў лялек і адзення для іх; выраб лялек.

**3 этап заключны:** апрабацыя лялек у дашкольных установах горада Глыбокае, пачатковых класах устаноў адукацыі горада, школе ранняга развіцця Цэнтра, цэнтры карэкцыйна – развіваючага навучання і рэабілітацыі; прэзентацыя праекта "Лялька. Бай" на метадычным аб'яднанні педагогаў дадатковай адукацыі Глыбоцкага раёна; прэзентацыя праекта на раённых, абласных конкурсах, святах, мерапрыемствах; выраб рэкламнай прадукцыі (банер, буклеты, календары).

**Асноўныя віды дзейнасці ў праекце:** пошукава-даследчая, творчая, гульнёвая, практычная.

**Пажаданыя вынікі:**

- выраб цацкі-лялькі з беларускім каларытам з агучкай на беларускай мове;
- развіццё творчых і маўленчых здольнасцей дзяцей і падлеткаў;
- выхаванне любові і павагі да роднай мовы;

- ❖ далучэнне дзяцей і падлеткаў да вытокаў беларускай культуры і выхаванне павагі да яе;
- ❖ захаванне нацыянальных традыцый;
- ❖ выхаванне творчай асобы;
- ❖ павышэнне матывацыі да даследчай дзейнасці і развіццё пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў;
- ❖ развіццё партнёрскіх сувязяей з мясцовымі ўстановамі адукацыі і культуры для трансляцыі і папулярызацыі вопыта праектнай дзейнасці;
- ❖ сеткавае ўзаемадзеянне з установамі адукацыі і культуры рэгіёна.

**План работы ў праекце**

| № п/п | Мерапрыемствы |
|---|---|
| 1. | Пачатак рэалізацыі праекта “Лялька.Бай. Знаёмства ўдзельнікаў праекта. Знаёмства з ідэяй праекта. |
| 2. | Работа ў творчых групах. Распрацоўка прататыпу лялькі. |
| 3 | Наведванне раённай бібліятэкі, работа з дакументальнай і мастацкай літаратурай па пытаннях праекта. Знаёмства з творчасцю народных майстроў Глыбоччыны, якія вырабляюць лялькі. |
| 4 | Экспедыцыя па залах гісторыка–этнаграфічнага музея ў г.Глыбокае. Работа ў творчых групах у музеі. Знаёмства з архіўнымі матэрыяламі музея па гісторыі і традыцыям Глыбоччыны. |
| 5 | Экскурсія у Дом рамёстваў –знаёмства з майстрамі па вырабу лялек. Майстар–клас па вырабу лялькі –мотанкі ад Фаміной Т.А. Знаёмства з творчасцю майстра Глыбоцкага Дома рамёстваў па вырабу драўлянай цацкі В.Б.Дудкевіча. |
| 6. | Работа з інтэрнэт–рэсурсамі па пошуку музычных твораў дзіцячага фальклору на беларускай мове. Праслухоўванне і падбор музычнага напаўнення (беларускія песні і калыханкі) для лялек. |
| 7. | Музычная праграма ў Цэнтры дзяцей і моладзі “Матуліна калыханка”. |
| 8.. | Майстар–клас педагога дадатковай адукацыі Цэнтра Сініца А.А. па выкананню беларускіх народных песен. Чытанне і падбор казак для напаўнення лялькі. Віктарына “Ці добра ты ведаеш беларускія народныя казкі” |
| 9. | Распрацоўка эскізаў прататыпаў лялек. Распрацоўка эскізаў адзення для лялек. Творчая праца па вырабу лялек |
| 10. | Распрацоўка тэкста пра гісторыю Глыбоччыны для агучкі лялек.Напаўненне флэш–назапашвальнікаў музычнымі і мастацкімі творамі. |
| 11. | Канчатковае афармленне лялек і апрабацыя іх у:<br>- дашкольных установах горада;<br>-у пачатковых класах навучальных устаноў горада;<br>-цэнтры карэкцыйнага развіцця і рэабілітацыі,<br>-у Школе ранняга развіцця Цэнтра дзяцей і моладзі; |

12. Афармленне праекта і мультымедыйнай прэзентацыі.
13. Прэзентацыя праекта на метадычным аб’яднанні педагогаў дадатковай адукацыі.
14. Прэзентацыя праекта на выставах, конкурсах і фестывалях.

Па задумках аўтараў ідэі праекта “Лялька.Бай” прадугледжаны выраб тэкстыльных лялек з беларускім каларытам, якія спяваюць і размаўляюць па-беларуску.Магчымасць лялек “спяваць” і “размаўляць” па-беларуску дала назву праекту(“размаўляць”, “баіць”(ад слова “гаварыць”).

Падчас рэалізацыі праекта праведзена даследчая работа па пошуку матэрыялу аб вытворчасці лялек на Беларусі, лялек, якія “спяваюць” і “размаўляюць”па-беларуску.(Матэрыялы па даследчай дзейнасці змешчаны ў QR-кодзе.).Па выніках даследчай дзейнасці стала вядома, што такіх лялек ў вытворчасці Беларусі няма і гэта дало магчымасць развіваць ідэю далей.

*QR-код. “Дзе і якія лялькі вырабляюць у Беларусі.”*

Па ідэі праекта абрана тры лялечных персанажы: Весялінка “спявае” вясёлыя песенькі, Сплюша-калыханкі, Дзед Баюн распавядае казкі. Музычны эфект лялек забяспечваецца праз партатыўную калонку з флэшназапашвальнікам унутры лялькі, на якім запісаны музычны і літаратурны матэрыял згодна з вобразам.

На першых кроках работы праекта прайшло знаёмства ўдзельнікаў, знаёмства з яго ідэяй, распрацаваны план. Праведзены экскурсіі ў гісторыка-этнаграфічны музей горада Глыбокае і Дом рамёстваў, раённую і школьныя бібліятэкі. Ўдзельнікі экскурсій і экспедыцый пазнаёміліся з гісторыяй касцюма глыбоцкага строю, наведалі выставы і прынялі ўдзел у майстар-класах па вырабу цацак у мясцовых майстраў, працавалі з дакументальнай і мастацкай літаратурай і інш.

*QR-код. Экскурсія ў Дом рамёстваў. Майстар В.Б. Дудкевіч*



*Удзельнікі праекта падчас экспедыцыі ў Глыбоцкі гісторыка-краязнаўчы музей*


*Майстар-клас па вырабу лялек у Глыбоцкім Доме рамёстваў.*

На этапе творчай працы ў праекце распрацаваны эскізы і выкрайкі лялек, выкрайкі адзення і абутку для іх. (Этапы вырабу лялек у QR-кодзе)

Для агучкі выробленых лялек выкарыстаны дзіцячыя песні, калыханкі і казкі ў выкананні юных і дарослых беларускіх спевакоў і чытальнікаў.(Музычны рэпертур лялек у Дадатку 1)

*QR-код. Этапы вырабу лялек.*



*Апрабацыя лялек у дзіцячым садку*

Падчас апрабацыі лялькі вызвалі шмат добрых эмоцый і пацуццяў у малодшых гурткоўцаў і выхаванцаў дашкольных устаноў, навучэнцаў пачатковых класаў школ горада і цэнтра карэкцыйнага развіцця, Школы ранняга развіцця Цэнтра дзяцей і моладзі. (Моманты апрабацыі ў QR-кодзе)

*У дзіцячым садку* | *Спявае Весялінка* | *Распавядае Дзед Баюн* | *Спявае Сплюша*

Удзел у праекце для навучэнцаў стаў важным у плане далучэння іх да вытокаў беларускай культуры, пашырэння ведаў пра беларускі фальклор, беларускую мову, выхавання творчай асобы, захавання нацыянальных традыцый і спадчыны. Ўдзельнікі атрымалі самыя найлепшыя ўражанні ад выніка – выробленых лялек, якія спяваюць беларускія песні, калыханкі, распавядаюць казкі. А самае галоўнае тое, што навучэнцы Цэнтра дзяцей і моладзі прыдумалі і рэалізавалі вельмі цікавую ідэю, якая не пакінула нікога раўнадушным да яе.







**Водгукі удзельнікаў праекта**

| | |
|---|---|
| ***Ксенія Любоза, 12 гадоў***  *-Праект «Лялька.Бай»-гэта проста цуд,які кожнай дзяўчынцы падарыў мару-любімую ляльку,якае спявае і размаўляе па-беларуску.Мне да даушы лялька Весялінка.З ёй цяпер заўсёды побач.З ёй дзялюся думкамі і марамі.* |  ***Юлія Атопкіна, 17гадоў*** *-З праектам з першых крокаў. Я закахалася ў праект, які даў мне магчымасць рэалізаваць сябе ў плане творчасці і сацыялізацыі. Не аднойчы выступалі з інтэрв'ю ў газетах і іншых выданнях ,на прэзентацыях абласных і рэспубліканскіх мерапрыемстваў. А нашы лялечкі для кожнага ўдзельніка праекта-нашы лепшыя сяброўкі, сястрычкі.* |
|  ***Аксана Рудак, 17гадоў*** *-Праект «Лялька.Бай»-штосьці не звычайнае не толькі для нас, хто іх прыдумаў, але і для ўсёй Беларусі. Лялек,якія размаўляюць пакуль што няма ў Беларусі.Мы марым,каб нашы лялькі з'явіліся ў кожнай дзяўчынкі ці хлопчыка,а таксама ў кожнай дашкольнай установе.Бо дзецям яны вельмі падабаюцца.Я гордая таму,што наш праект спадабаўся ўсім.Мы вельмі стараліся!* |  ***Ксенія Талкач, 12 гадоў*** *-Лялькі, якія спяваюць і размаўляюць па-беларуску, сапраўдная знаходка для нас. Разам з такімі лялькамі кожнаму з нас хочацца спяваць і размаўляць па-беларуску, не гледзячы на ўзрост.* *Мне падабаюцца ўсе лялькі,асабліва Весялінка.Яны прыгожыя і вельмі прыемныя.* |
|  ***Марыя Вайцяховіч, 7 гадоў*** *-Ляльку Сплюшу мне набыла матуля, бо калі я яе пабачыла, не хацела ад яе адыходзіць. Лялька Сплюша, якую я трымала адразу спадабалася мне сваёй прыгажосцю і ласкавымі песенькамі-калыханкамі. «Па крысе, на расе, засыпаюць зоркі-сплюшкі»,-спявае яна.А гэта мая любімая песенька.Дзякуй маёй матулі за такі падарунак.* |  ***Яўгенія Міхайлаўна Рубашка, педагог дадатковай адукацыі.****-Вельмі спадабалася прымаць удзел у праекце «Лялька.Бай». Свой унёсак у праекце зрабіла ў творчай працы, тым самым, у кожную ляльку, якую зрабіла я ўкладзена шмат цеплыні, дабрыні і творчасці.* *Як матуля магу адказаць, што нашым дзецям сёння вельмі важна мець такую ляльку дома каб навучыць дзяцей любіць родную мову і размаўляць на ёй. Лялькі простыя ў выкананні і выкарыстанні. Кожны з вас сама зможа падабраць пэўны матэрыял для вашага дзіцяці.* |

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Алексахин Н.Н., Алексахина Т.И. Изготовление игрушек по мотивам народных образцов. / Начальная школа – 1991. -№ 9. – с.49-52.

2. Глубокский историко-этнографический музей [Электронный ресурс] Режим доступа: http://glubmusej.by/ru/home. – Дата доступа: 01.10.2016.
3. Глыбоччына: ад старажытнасці да сучаснасці / рэдкал. : Т.У. Бялова [і інш.]. – Мінск: Беларус.Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. с. іл.
4. Глыбоччына. Зямля любімая навечна, дзе Доўгае і Беразвечча… / аўт. тэксту У.І. Бацкалевіч; фота К.Л. Дробава, А.П. Дрыбаса, А.В. Адэдэджы, М.М. Бегунковай; маст. В.Г. Паўлавец. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012. – 168 с. іл.
5. Дучиц Л. Как одевались наши предки // Деды: дайджест публикаций о беларуской истории. Выпуск 13. Минск, 2014. С. 213-233.
6. Зимина З.И. Текстильные обрядовые куклы. Методическое пособие. - Мн.:2006.
7. Касцюкевіч С.У. Беларуская народная цацка як сацыякультурны феномен і каштоўнасць // Материалы международной научно-практической конференции “Преподобная славянских народов”, посвященная 100-летию перенесения святых мощей преподобной Ефросиньи Полоцкой из Киева в Полоцк. – Полоцк, 2010. - С. 138
8. Касцюкевіч С.У. Цацкі-прылады для гульні ў беларусаў // Веснік ПГУ. № 4. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2005.
9. Лозка А., Лявонава А. Беларуская цацка і гульня: Матэрыялы ў дапам. стваральнікам цацак і гульняў на аснове бел. нар. мастацтва, этнагр. і фальклору. Мн., 1996.
10. Церашковіч Т. Лялька беларуская. Мн., 1992. 126с.: іл.